Голубева Наталья Павловна

Дзве сястры

да Дня народнага адзінства

Над Бугам быў чутны той плач
З далёкай і блізкай мяжы…
Кружыўся галодны крумкач
Над сэрцам Заходняй сястры.

І Сож адчуваў тое гора…
Міналі няспынна гады.
І выцекла цэлае мора –
Слёзаў Усходняй сястры.

Густою ссівелаю хмарай
Сясцёр падзялілі дваіх.
Сустрэча была толькі марай,
Што спела ў сутоннях начных.

За шчасце абодвух бакоў
Прастора навокал грымела.
Лілася бязлітасна кроў,
Што ў венах так доўга кіпела.

І сёння – спеў птушак у высі.
І радасці вольныя хвалі.
Сястры дзве ў абдымках зліліся –
Нібыта іх не разлучалі.